
Падтрымай "Вясну" на PATREON

# У Беларусі тыдзень пачынаецца з новых пратаколаў, судоў і сутак дапоўнена

18.05.2020 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў

**Па апошніх дадзеных праваабаронцаў “Вясны”, у перыяд з 6 траўня у Беларусі 55 чалавек атрымалі агулам больш за 500 сутак арышту. Яшчэ больш за 30 чалавек былі аштрафаваныя на агульную суму, якая перавышае 13000 долараў. І гэтыя лічбы неканчатковыя. Суды над удзельнікамі сустрэч з блогерам Сяргеем Ціханоўскім ці акцый па “кармленні галубоў” будуць працягвацца і на бліжэйшым тыдні. Акрамя таго, у рэгіёнах працягваюць складаць пратаколы за гэтыя акцыі і мірныя сустрэчы.**

## Брэст

У 14.30 у судзе Ленінскага раёна Брэста распачнецца суд над экаактывісткай, праціўніцай акумулятарнага завода **Людзмілай Карчэўскай**. Яе вінавацяць у тым, што ўдзельнічала ў акцыі па “кармленні галубоў” 12 красавіка. Вынік суда - **50 базавых велічынь штрафу (1350 рублёў).**

Таксама мусіць адбыцца працяг суда над **Валерам Фамінскім**, які амаль увесь мінулы тыдзень правёў у ізалятары, хоць на “суткі” асуджаны не быў. Фамінскага затрымалі 10 траўня пасля нядзельнай акцыі па “кармленні галубоў”. У аўторак яму прысудзілі 30 базавых велічынь штрафу і адразу пасля суда затрымалі ізноў. Пасля гэтага ён яшчэ трое сутак прабыў у ізалятары. У пятніцу пасля сканчэння 72-гадзіннага тэрміну зняволення актывіста адпусцілі, а судовае пасяджэнне перанеслі на наступны тыдзень.

У выніку Фамінскаму далі 3**0 базавых велічынь штрафу (810 рублёў)** за ўдзел у трох акцыях: 12 красавіка, другога і трэцяга траўня.

Акрамя таго, на выходных на мяжы быў затрыманы яшчэ адзін праціўнік завода АКБ, дальнабойнік **Павел Кінчак**. Як паведамляе “Брэсцкая газета”, днём 16 траўня Павел вяртаўся з грузам з Польшчы ў Беларусь. Яго затрымалі адразу пасля пераходу мяжы. Яму інкрымінуюць удзел у несанкцыянаванай акцыі пратэсту супраць акумулятарнага завода, якая праходзіла ў Брэсце 12 красавіка. Да суда яго змясцілі ў ізалятар. Судзіць Паўла будуць у судзе Ленінскага раёна **19 траўня ў 10.30.**

## Мінск

Як стала вядома праваабонцам, яшчэ 12 траўня суддзя суда Фрунзенскага раёна **Дмітрый Лукашэвіч** прысудзіў агулам **30 базавых велічынь штрафу (810 рублёў)** затрыманаму каля гандлёвага цэнтру Mile **Сяргею Жураву**. Судзілі Сяргея па двух адміністрацыйных пратаколах: за непадпарадкаванне міліцыі (арт. 23.34 КаАП) і за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (арт. 23.34 КаАП). Таксама на 30 базавых велічынь судом Заводскага раёна быў аштрафаваны **Яўген Дубовік**.




### Суткі, штрафы, затрыманні. У Беларусі працягваецца пераслед удзельнікаў акцый

У пятніцу, 15 траўня, па ўсёй Беларусі працягваюцца суды над людзьмі, якія выходзілі на мясцовыя акцыі пратэсту: у падтрымку экаактывістаў Берасця ("кармленне галубоў") і ў падтрымку блогера Сяргея Ціханоўскага, а таксама над людзьмі, якія выказваліся пра сацыяльныя праблемы ў стрымах блогера Ціханоўскага.

## Вілейка

На 15.00 прызначаны разгляд адміністрацыйнай справы мясцовага актывіста, сябра Партыі БНФ **Аляксея Сюдака**. На яго былі складзены два пратаколы за парушэнне заканадаўства аб масавых мерапрыемствах (арт. 23.34 КаАП). Пра тое, што пасяджэнне суда адбудзецца менавіта ў гэты дзень і гэты час, Аляксей даведаўся толькі ў 10 ранку праз смс-паведамленне, то бок за пяць гадзін да пачатку пасяджэння. Актывіст накіраваў скаргу ў раённую пракуратуру з пазнакай таго, што такое позняе паведамленне аб судзе не дае яму магчымасці спланаваць свой час і, у першую чаргу, знайсці сабе абаронцу.

У выніку Аляксея Сюдака прысудзілі да **10 сутак арышту**. Такое рашэнне прыняла суддзя Вілейскай раённага суда **Алена Ахметава**.



Пракурору Вілейскага раёна

Шукрынаву Вадзіму Аляксандравічу

Сюдака Аляксея Валер'евіча

[redacted]

скарга.

Спадар пракурор! 18.05.2020 г. мне на нумар тэлефона ў 10.03 прыйшло СМС-паведамленьне, што я выклікаюся ў суд Вілейскага раёну для разгляду справы аб адміністратыўным правапарушэньні.

Судовае паседжаньне прызначана на 15.00 18.05.2020 г. Гэта значыць, праз 5 гадзін пасьля таго, як мне адправілі паведамленьне.

Лічу, што такім чынам парушылі мае правы. Думаю, гэта зроблена адмыслова, каб я ня змог з'явіцца ў суд і падрыхтавацца да судовага паседжаньня і наняць адваката.

Прашу правесьці праверку.

18.05.2020 г.

Сюдак А.В.

# Наваполацк

На **Юлію Шэлепень** і на яе мужа склалі пратаколы па ч. 1 арт. 23.34 КаАП за тое, што 29 красавіка ўдзельнічалі ў сустрэчы з блогерам Сяргеем Ціханоўскім, калі той прыязджаў у Наваполацк. Таксама пратакол па арт. 23.34 КаАП складзены на **Артура Сіняга** за тое, што ўдзельнічаў у двух мірных сходах: ва ўжо згаданаў сустрэчы падпісантаў "Краіны для жыцця" 29 красавіка і ў "кармленні галубоў" трэцяга траўня.

# Гомель

Удзельніка сустрэчы салідарнасці з затрыманым блогерам Ціханоўскім, якая скончылася масавымі затрыманнямі, **Аляксандра Цібароўскага** будуць судзіць. У нядзелю яго выклікалі ў міліцыю, дзе паведамілі, што адміністрацыйная справа хутка будзе перадазеныя ў суд. Варта адзначыць, што затрыманую ў пятніцу ўдзельніцу той жа сустрэчы **Віялету Майшук** адпусцілі ў той жа дзень без складання пратакола.

ПЦ "Вясна" стала вядома, што на блогера **Сяргея Ціханоўскага** склалі новы пратакол за ўдзел у несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (арт. 23.34 КаАП). Пазней у канцылярыі суда Савецкага раёна Гомеля пацвердзілі TUT.BY, што Ціханоўскі асуджаны яшчэ **на 15 сутак**. Такім чынам, Ціханоўскі выйдзе на волю толькі 5 чэрвеня.




### Блогеру Ціханоўскаму, які сядзіць у ІЧУ, далі яшчэ 15 сутак арышту

Суд Савецкага раёна Гомеля 18 траўня асудзіў блогера Сяргея Ціханоўскага, які адбывае 15-дзённы арышт у ІЧУ Гомеля, яшчэ на 15 дзён арышту. Пра гэта TUT.BY распавялі ў канцылярыі суда.

## Віцебск

Суд Чыгуначнага раёну Віцебску 18 траўня разгледзеў адміністрацыйную справу ў дачыненні віцяблянкі **Дар'і К.**, якую вінавацілі ва ўдзеле ў несанкцыянаваным масавым мерапрыемстве (ч.1 арт. 23.34 КаАП) – "кармленні галубоў" 3 траўня. Дзяўчыну прызналі вінаватай і пакаралі штрафам у памеры **20 базавых велічынь (540 рублёў).**

Справу разглядала судзьдзя **Алена Цыганкова**.


Як распавяла «Віцебскай Вясне» Дар'я, на судзе ў якасці доказу яе вінаватасці паказалі відэа, на якім яна моўчкі стаіць сярод іншых людзей. У нейкі момант да дзяўчыны падышоў хлопец, каб пазнаёміцца, – яны перакінуліся фразамі.

> *«Ну глядзіце, вы ж размаўлялі!» – ажывілася суддзя… Карацей, няма словаў! Нейкі цырк учынілі! Правы мне ніякія не зачытвалі і напісалі нейкую ахінею. Я лічу, што на мяне чыніцца ціск»*, – кажа Дар'я.

Дар'я паведаміла таксама, што ў дачыненні да яе міліцыянты склалі **яшчэ адзін пратакол** за правапарушэньне, прадугледжанае арт. 23.34 КаАП, – гэтым разам **за ўдзел у стрыме блогера Ціханоўскага** 30 красавіка каля піраміды «Марка-сіці». Суд адбудзецца **25 траўня**.

Твитнуть






Бабруйчаніна будуць судзіць за "публічныя заклікі да арганізацыі мітынгу". Распавядаем, што гэта за артыкул


"Не менш за 100 000 чалавек укрыліся за мяжой". Выйшаў даклад УВКПЧ ААН пра сітуацыю ў Беларусі (дакумент)

Чатырох жыхароў Паставаў асудзілі да "хатняй хіміі" за фотаздымак з Маршу (дапоўнена)

Заява праваабаронцаў аб прызнанні 20 палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO

## ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА



У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

"Усё зроблена, каб паралізаваць тваю волю", — былая палітзняволеная Вольга Класкоўская

"Гэта ўсё адно велізарнае злачынства супраць чалавечнасці", — былы палітвязень шклоўскай калоніі

"Мораць голадам і холадам". Новыя сведчанні пра катаванні і акалічнасці смерці Вітольда Ашурка ў ПК-17

ГАЛОЎНАЕ

"Я, напэўна, проста памру тут": хто з палітвязняў знаходзіцца ў асаблівай рызыцы за кратамі







## АПОШНІЯ НАВІНЫ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік 2023

"Бяляцкі, прасі літасці!" У Швецыі прадставяць спектакль-чытку паводле твораў Бяляцкага і Знака

Валерыя Цапкалу завочна асудзілі да 17 гадоў калоніі ўзмоцненага рэжыму (дапоўнена)

Запрашаем на прэзентацыю дакладу “Абмежаванне свабоды выказвання меркаванняў пад выглядам барацьбы з экстрэмізмам і тэрарызмам” у Вільні

Палітзняволенай Вікторыі Кульшы ў трэці раз дадалі тэрмін па крымінальнай справе

Мужчыну асудзілі на два гады калоніі па двух дыфамацыйных артыкулах

Паўтара года калоніі прысудзілі экс-кандыдату ў прэзідэнты Андрэю Дзмітрыеву

У СІЗА-1 існуе "прэс-хата"? Сабралі сведчанні былых вязняў

Дырэктару газеты "Белорусы и рынок" Канстанціну Залатых прысудзілі чатыры гады калоніі

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

## Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Сакавік

# 2023










## ПАРТНЁРСТВА

РАЦЫЯ

## СЯБРОЎСТВА

ENEMO

E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY